**В. С. Новак**
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

# МІФАЛАГІЧНЫЯ ЎЯЎЛЕННІ ПРА РАСЛІННЫ І ЖЫВЁЛЬНЫ СВЕТ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ФАЛЬКЛОРУ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ)

Сярод матэрыялаў па народнай міфалогіі, запісаных у палявых экспедыцыях на тэрыторыі Гомельскай вобласці і захаваных у архіве навукова-вучэбнай фальклорнай лабараторыі кафедры рускай і сусветнай літаратуры ГДУ імя Францыска Скарыны, надзвычай сціпла прадстаўлены звесткі па міфалогіі жывёльнага і раслiннага свету. Засяродзім увагу на народных уяўленнях, звязаных з птушкамі і жывёламі.

Напрыклад, семантыка бусла як сакральнай для беларусаў птушкі звязана найперш з дабрабытам і сямейным шчасцем: «Бусел прыносіць шчасце і дзяцей». Невыпадкова зайздросцілі тым людзям, каля падвор'яў якіх буслы будавалі сваё гняздо: «Людзі завідавалі тым, у каго на хаце ці хляве было кубло») (запісана ў в. Рудня-Жураўлёва Брагінскага р-на ад Цярэшчанкі Аляксандра Паўлавіча, 1955 г. н.).



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Скідванне аднаго бусляняці з гнязда (з усяго вывадку птушак) прыводзіла, зыходзячы з народных вераванняў, да беднасці: «Еслі бусліха вывела дзяцей (ну, яны ці па троя ці па чэцвера) і скінула з кубля адно, значыць, з-за дзіця не купіш хлеба (бедным будзеш)» (запісана ў в. Малейкі Брагінскага р-на ад Зялец Ганны Рыгораўны, 1937 г.н.). Як адзначылі даследчыцы Т. Валодзіна і Л. Салавей, «разуменне бусла як апекуна і распарадчыка ўраджаем і дабрабытам, як істоты, што «прыносіць» дзяцей, сцвярджае натуральнасць яго знаходжання сярод гурту калядоўшчыкаў» [1, с. 52–53].

Вераб'ёў, напрыклад, на Брагіншчыне называлі «канаплянікамі»: «Канаплянікі (вераб'і) – вяртуны, вельмі рухомыя, вельмі шмат жыве пад стрэхамі». Паводле сведчанняў інфарматараў, «верабей – проклятая птушка. Ён прыносіў катам цвікі для распяцця Хрыста». За гэтыя дзеянні і атрымаў праклящце ад Бога: «За гэта Бог прокляў вераб'ёў і спавіў нябожнымі путамі, таму вераб'і скачуць» (запісана ў в. Рудня-Жураўлёва Брагінскага р-на ад Цярэшчанкі Аляксандра Паўлавіча, 1955 г. н.). Паводле іншай версіі, «верабей скача дзвюма ножкамі адразу, бо за правіннасць у часе выбараў птушынага цара яму звязалі ногі» [1, с. 77].

У адрозненне ад вераб'я, менавіта ластаўка імкнулася дапамагчы Хрысту: «ластаўкі выкінулі» цвікі, прынесеныя вераб'ём для распяцця Хрыста. «Ластаўка – чыстая, святая птушка, надзеленая жаночай сімволікай. … гняздо ластаўкі пад страхой забяспечвае дому шчасце і боскую ласку» [2, с. 242]. У мясцовых запісах звестак сустракаецца матыў прадказання гэтай птушкай адмоўных з'яў: «Ластаўка ў хату заляцела – да няшчасця» (запісана ў в. Шырокае Буда-Кашалёўскага р-на ад Балобан Евы Рыгораўны, 1929 г. н. (раней пражывала ў в. Пучын Брагінскага р-на)).

«Сарока з'яўляецца разносчыцай навін, яе стракатанне абяцае прыбыццё гасцей, змену надвор'я на дажджлівае, прадказвае нейкае здарэнне ці нават смерць» [1, с. 452]. Як адзначаюць мясцовыя жыхары, «сарока прыносіць весткі плахія» (запісана ў в. Шырокае Буда-Кашалёўскага р-на ад Балобан Евы Рыгораўны, 1929 г. н. (раней пражывала ў в. Пучын Брагінскага р-на)).

Адным з найбольш міфалагізаваных вобразаў жывёл у традыцыйнай культуры ўсходніх славян з'уляецца заяц, які «належыць не проста памежнай зоне паміж гэтым і якім-небудзь з іншых светаў, а менавіта мяжы паміж светам (космасам) і нясветам (хаосам) як гэткімі» [3, с. 187]. З гэтай жывёлай былі звязаны ўяўленні аб тым, што ўбачыць гэту істоту на сваім шляху – «сустрэць» няшчасце: « … заяц, які перабягае дарогу ці сустракаецца на шляху, прадказвае падарожніку няшчасце …» [4, с. 287]. Паводле сведчанняў А. П. Цярэшчанкі, 1955 г. н., «непажадана была сустрэча з зайцам у час вяселля. …Заяц – плахая прыкмета, будзе гора» (запісана ў в. Рудня-Жураўлёва Брагінскага р-на).

У міфапаэтычнай карціне свету беларусаў пэўнае месца займаюць і народныя вераванні, звязаныя з раслінным светам. У традыцыйнай карціне свету беларусаў важнае месца належыць дрэву як аб'екту пакланення, універсальнаму медыятару, своеасаблівай міфалагічнай праекцыі свету, што ўключае нябесную, зямную і падземную часткі, метафарычнаму вобразу дарогі, сімвалічнаму шляху, па якому герой мог апынуцца ў замагільным свеце. Бяроза «сімвалізуе жаночы пачатак і менавіта таму стала вызначальным атрыбутам шэрагу святочных рытуальна-абрадавых комплексаў, асноўнымі ўдзельнікамі якіх былі дзяўчаты перадшлюбнага ўзросту» [1, с. 56].

Адным з найважнейшых аспектаў міфалогіі дрэва з'яўляюцца яго сімвалічныя стасункі з чалавекам, аб чым сведчаць шматлікія сюжэты аб ператварэнні чалавека ў дрэва. Напрыклад, паводле народных уяўленняў, бяроза – «гэта маладая дзеўка» (запісана ў Брагінскім р-не ад Данчанка Васіліны Ціханаўны, 1944 г. н.). Аб ператварэнні жанчыны ў бярозу запісаны цікавыя звесткі ад жыхаркі в. Парычы Светлагорскага р-на Скуднай Тамары Нілаўны, 1926 г. н.: «Шчэ вось ад бабкі чула. Жылі мужык з жонкаю. Мужык быў прыгожы, магутны, усё ў яго руках гарэла. Жонка яго з другім ухажорылася. Ноччу з ухажорам тым яны забілі мужыка таго насмерць, калі той спаў. Бог, бачачы такое, абярнуў жонку ў бярозу. Цяпер яна кожны год плача – сок пускае. Палюбоўніка абярнуў у асіну, якая трасецца ад страху. А мужа – у дуб высокі, прыгожы, магутны. Было так» .

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Зыходзячы з народных вераванняў, бяроза – шчаслівае дрэва, аднак запісаныя звесткі дазваляюць выказаць меркаванне пра амбівалентны характар народных вераванняў: з аднаго боку, бяроза асэнсоўваецца як дрэва, якое аказвае станоўчы ўплыў, з другога боку, як дрэва з негатыўнай семантыкай. «Старыя людзі казалі, што гэта шчаслівае дрэва» (запісана ў Брагінскім р-не ад Данчанка Васіліны Ціханаўны, 1944 г. н.). Паводле сведчанняў Сафіі Васільеўны Калядзенка, 1935 г. н., з в. Пірэвічы Жлобінскага р-на, «бярозу пасадзіць – шчасце набыць». Невыпадкова калі ўжо выбралі месца для будаўніцтва хаты, то «садзілі бярозу на шчасце» (запісана ў Брагінскім р-не ад Данчанка Васіліны Ціханаўны, 1944 г. н.). Як адзначылі жыхары в. Сякерычы Петрыкаўскага р-на, «бяроза – гэта дрэва, якое нельга садзіць ля хаты, бо яна здароўе забярэ і душу чалавека» (запісана ад Кісель Вольгі Іванаўны, 1934 г. н.).

Верылі, што лісце бярозы, кінутае ў першую баразну (напрыклад, калі садзілі бульбу), паспрыяе добраму ўраджаю: «Калі свёкар мой араў землю пад жыта ці садзілі картошку пад каня, то ў першую бараздy кідаў бярозавае лісце, штоб буў добра ўраджай» (запісана ў в. Рудня-Жураўлёва Брагінскага р-на ад Цярэшчанкі Паўла Апанасавіча, 1928 г. н., Цярэшчанка Таццяны Іванаўны, 1930 г. н.).

У адрозненне ад бярозы, ніколі не садзілі каля хаты асіну, бо гэта «праклятае дрэва» [2, с. 292], што пацвярджаюць і мясцовыя жыхары: «Гром заўсёды выбіраў асіну, таму з яе не дзелалі хат і не садзілі ў дзярэўні». У народзе з гэтым дрэвам звязвалі нячыстую сілу. Верылі, што «ў вываpачаных асінавых карчах жывуць гадзюкі, чэрці. На осінавы пень нікогда нельзя садзіцца» (запісана ў в. Рудня-Жураўлёва Брагінскага р-на ад Цярэшчанкі Паўла Апанасавіча, 1928 г. н., Цярэшчанка Таццяны Іванаўны, 1930 г. н.). У пераважнай колькасці павер'яў пра асіну гучыць матыў, звязаны з гэтым дрэвам як «д'ябальскім»: «Гэта паганае дрэва з-за таго, што яго пракляў Бог па той прычыне, што яно не пакланялася Хрысту, як іншыя дрэвы. На асіне павесіўся здраднік Іуда, таму лісце восенню становіцца крывава-чырвоным. Гэта напамін пра няправедную кроў Іуды» (запісана ў Бялёў Жыткавіцкага р-на ад Жогаль Арыны Міхайлаўны, 1910 г. н.).

Вярба ў народных вераваннях асэнсоўваецца як дрэва, якое спрыяе здароўю чалавека («Вярба прыносіць здароўе і засцерагае ад хваробы» яго дабрабыту («Мы, старые, верылі і верым, што вярба спрыяе ўсяму добраму» уплывае на павелічэнне надояў малака ў каровы («Першы раз у поле карову выганялі толькай свячонай вярбы. Тады яна будзе даваць многа малака і не будзе балець») (запісана ў Брагінскім р-не ад Данчанка Васіліны Ціханаўны, 1944 г. н.)), засцерагае ад шкоднага ўздзеяння нячыстай сілы («Бацька мой казаў, што вярба абярагае ад хваробы і нечысці, уплывае на здароўе і жыццяздольнасць» (запісана ў в. Рудня-Жураўлёва Брагінскага р-на ад Цярэшчанкі Аляксандра Паўлавіча, 1955 г. н)). Паводле сведчанняў Паўлюковай Валянціны Мікалаеўны, 1930 г. н., з в. Салтанаўка Жлобінскага р-на, «добры звычай у нас ё з вярбой. На гэтае ж васкрысенне мы пляцаем адзін другога дубчыкамі вярбы свячонай. Тады, гавораць, будзеш здаровы і крэпкі».

У народнай традыцыі было прынята садзіць вярбу каля хаты, а ёлку асцерагаліся садзіць: «Мой бацька казаў, што калі пасадзіць ёлачку ля хаты і калі яна вырасце вышэй хаты, то хто-небудзь памрэ з гэтай хаты» (запісана ў в. Рудня-Жураўлёва Брагінскага р-на ад Цярэшчанкі Паўла Апанасавіча, 1928 г. н., Цярэшчанка Таццяны Іванаўны, 1930 г. н.). Калі ў народных вераваннях ёлка асэнсоўвалася як дрэва, якое сімвалізавала набліжэнне смерці (менавіта таму і пазбягалі таго, каб гэтае дрэва расло каля хаты), то галінкам клёна надавалася станоўчая семантыка. Лічылася, што менавіта ў «гэтых дрэўцах хаваюцца душы памерлых продкаў, яны слядзяць за намі і прыяюць нам» (запісана ў в. Рудня-Жураўлёва Брагінскага р-на ад Цярэшчанкі Паўла Апанасавіча, 1928 г. н., Цярэшчанка Таццяны Іванаўны, 1930 г. н.).

Ліпу лічылі святым дрэвам, бо меркавалі, што «пад ім аддыхае Божа мацер, калі спускаецца на зямлю» (запісана ў в. Рудня-Жураўлёва Брагінскага р-на ад Цярэшчанкі Паўла Апанасавіча, 1928 г. н., Цярэшчанка Таццяны Іванаўны, 1930 г. н.).

Вышэйпрыведзеныя матэрыялы раскрываюць асаблівасці светапогляду беларусаў, пацвярджаюць факт паэтычнага ўспрымання імі навакольнага свету, дэманструюць адметную мясцовую спецыфіку народных вераванняў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## Спіс выкарыстаных крыніц


1 Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўн. / С. Санько [і інш.]; склад. І Клімковіч. – 2-ое выд., дап. – Минск : Беларусь, 2006. – 599 с.

2 Славянская мифология. Энциклопедический словарь. – Москва, Эллис Лак, 1995. – 416 с.

3 Міфалогія беларусаў: Энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Минск : Беларусь, 2011. – 607 с.

4 Славянские древности: Этнолингвистический словарь: в 5 т. / под общей ред. Н. И. Толстого. Т. 2: Д–К (Крошки). – Москва : Междунар. отношения, 1999. – 704 с.


ОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОР